## • Жыццё: як яно ёсць

# УСЯМУ ВІНОЙ

Вайна так ці інакш пабывала ў кожным доме нашай шматпакутнай Беларусі. І сёння яна ў незагоеных ранах ветэранаў, у беражліва захоўваемых пахавальных, у парэзаных маршчынамі тварах салдацкіх удоў і маці.

Аб Ганне Дзянісаўне Зубачовай даведалася пры выпадковай сустрэчы з былым работнікам райкома партыі Васілём Трафімавічам Пыткіным. Лёс жанчыны зацікавіў, захацелася пазнаёміцца асабіста.

Вырашыла, навошта загадзей папярэджваць аб наведванні, і так павінна быць дома, бо гады ўжо немаладыя. Так яно і выйшла. Ганна Дзянісаўна адпачывала на цёплай печы, а дачка Праскоўя Максімаўна завіхалася па дамашняй гаспадарцы. Даведаўшыся, хто я і чаго прыйшла да іх, паклікала маці.

Тая нетаропка злезла з печы і падыйшла да стала. Прызнацца, калі сабіралася ў Баханы, думала, як пачаць размову, каб не прычыніць боль, бо ўжо ведала, што лёсу яе не пазайздросціш. Але слова за словам і разгаварыліся.

Нарадзілася і вырасла яна ў Баханах, у сялянскай сям'і. З дзяцінства была прывучана да працы: навучылася і жаці, і касіці, і грабаці. Адно, аб чым шкадуе жанчына, не давялося вывучыцца грамаце.

— Са сваім будучым мужам Максімам Карпавічам, можна сказаць, сябравала з дзяцінства, — ціха расказвае Ганна Дзянісаўна. — Я вельмі саромелася нават каля іх хаты праходзіць: моладзь раней не такой была, як цяпер. Калі забралі на службу ў армію, абяцала чакаць. А чакаць прыйшлося доўга: пачалася першая сусветная вайна. Вярнуўся дамоў хворым: па ўсяму целу балячкі. Гэта было ад таго, што днявалі і начавалі ў акопах. Год сябравалі, а затым вянчаліся ў царкве. А як жа, змалку веруючыя былі.

Раней строга прытрымліваліся звычаю: жонцы жыць у хаце мужа разам з бацькамі. Па ліку чацвёртай нявесткай увайшла ў сям'ю. А ўсяго яна складалася з 15 чалавек. Працаваць прыходзілася многа. Самі і пралі, і ткалі. Цяжка было з абуткам, вось і хадзілі босыя амаль да самых маразоў.

Адзін за адным нарадзіліся дзеці: Паша, Мар'я, Іван, Ніна (памерла ва ўзросце тры гады), Афанасся. Пабудавалі хату, ужо толькі для сваёй сям'і. Абзавяліся гаспадаркай: мелі свайго каня, карову, свіней, курэй. Калі ўтварыўся калгас, уступілі. Толькі прыйшлося каня і карову аддаць у калектыўную гаспадарку.

Не цуралася Ганна Дзянісаўна ніякай работы, што казалі, тое і рабіла. Максім Карпавіч быў калгасным конюхам, старэйшая дачка Паша таксама працавала ў калгасе. Разам з маці нарыхтоўвалі дровы, даглядалі жывёлу,аралі, скародзілі. Перад пачаткам вайны з Германіяй жылі ўжо няблэнна. Мар'я вывучылася на настаўніцу, а Іван паехаў вучыцца на Каўказ у ФЗВ на будаўніка. Усё складвалася добра, калі б не тая летняя раніца 22 чэрвеня. Вайна...

Праз некалькі дзён Ганна Дзянісаўна праводзіла мужа. Не думала, не гадала, што бачыла яго ў апошні раз. Толькі пасля заканчэння вайны ад мужчынаднавяскоўцаў даведалася, што Максім Карпавіч трапіў у нямецкі палон разам са сваім братам Рыгорам. Была магчымасць уцячы, але Максім Карпавіч не змог пакінуць хворага брата. Там і памёр сам ад здзекаў, голаду і холаду.

— Недзе пад Канатопам ляжаць яго костачкі, — выціраючы слёзы краем хустачкі, з болем сказала Ганна Дзянісаўна.

У акупацыю жыла з дочкамі тут жа ў Баханах. Немцы калгасную зямлю раздзялілі на паі. Цяжка было, але ж і карысць: хоць бульбу, хлеб мелі, а вялікім падспор'ем была і бурэнка. Да мясцовых жыхароў захопнікі адносіліся цярпіма. Не ўчынялі расстрэлаў. Ды і з кім ім было ваяваць: у вёсцы старыя ды жанчыны з дзецьмі засталіся, мужчыны ж усе на фронце. Партызаны рэдка наведваліся. Затое марадзёры пад імем «партызан» захаджвалі.

— Быў адзін раз такі выпадак, — устаўляе дачка Афанасся Максімаўна, якая прыйшла праведаць маці. — Прыйшлі гэтыя «партызаны» і пазабіралі ў нас адзенне, прадукты харчавання, нават адабралі ў мяне шкарпэткі вязаныя...

Часта дзеці прачыналіся ад таго, што маці плакала. Не выходзіла з галавы думка аб сыночку: дзе ён, што з ім?

Так склалася, што Праскоўя выйшла замуж. Вайна вайной, а маладосць брала сваё. Муж яе, Антон Трафімавіч Крайнеў, перайшоў жыць да іх. Стала крыху лягчэй. Ды яшчэ і надзея была: дачакацца вызвалення.

— Калі з усходу сталі чутны гарматныя стрэлы, жыхары вёскі і наша сям'я сталі ўцякаць і хавацца ў лесе, бо ведалі, немцы не церпяць паражэння, звяруюць, — дапаўняе ўжо

# ВАЙНА

расказанае маці і сястрой Праскоўя Максімаўна. — Вярнуліся дамоў, а хата згарэла, толькі адзін хлеў застаўся. І адзення ніякага, усё згарэла: засталося тое, што паспелі забраць у лес. Праз некаторы час мужа майго забралі ў армію. А ў 1945 годзе прыйшла пахаванка. Так і не даведаўся, што ў нас сын нарадзіўся...

— Памятаю, як зараз, той дзень. З раніцы ўправілася па гаспадарцы. Усё, здаецца, у парадку. Толькі сэрца шчыміла,— расказвае зноў Ганна Дзянісаўна, — падказвала, што быць бядзе. Паштальёнка працягнула канверт: пахаванка на сына. Думала, сэрца разарвецца ад болю, але, відаць, яно было моцным — усё вытрымала. У пахаванцы паведамлялася, што Іван загінуў геройскі: згарэў у танку пры вызваленні г. Утмань, што на Украіне.

Усё. Больш чакаць некага. Начамі да самага світанку Ганна Дзянісаўна думала: за што Гасподзь паслаў сям'і столькі выпрабаванняў? Чаму адняў мужа, з якім пражылі кароткае, але шчаслівае жыццё, сына, зяця. Яны ж не займалі на свеце чужога месца, былі ласкавымі, добразычлівымі. Дык чаму ж ім было наканавана памерці так рана? Адказу не магла знайсці.

А раніцай ішлі працаваць, паднімалі калгас. Адначасова будавалі хату. Лес вазілі на карове. Дзякуй, мужчыны, якія вярнуліся з фронту, дапамагалі ўдаве.

— У маці нашай быў добры голас, — расказвае Афанасся Максімаўна. — Спявала прыгожа народныя песні. У лесе пілуем дровы — спявае і плача. А крыху ўзнімецца настрой — спявае вясёлыя песні.

З гадамі стала прытупляцца гора. Але як бы злавесны рок праследаваў гэту сям'ю. Трэба ж так здарыцца, што пры рамонце дома трагічна загінуў унук, сын Праскоўі. Проста неймаверна, што адзін чалавек можа вынесці столькі ўдараў! Як сказала Ганна Дзянісаўна, толькі вера ў Бога і дапамагла выжыць.

Да самай пенсіі Ганна Дзянісаўна працавала ў калгасе. Зараз у хаце з ёю жывуць Праскоўя і Мар'я, якая пасля смерці мужа перабралася ў Баханы. Яны таксама ўжо пенсіянеры. Жанчыны трымаюць падсобную гаспадарку, апрацоўваюць прысядзібны ўчастак. Вялікую дапамогу аказваюць родзічы.

— Ведаеце, хоць і маці ўжо старэнькая, — кажа Афанасся Максімаўна, — ужо 98, але яшчэ корпаецца, нават градкі палола, бульбу крыху. Раней яна вельмі любіла пячы хлеб свой. Даволі смачны атрымліваўся. Нават і цяпер падказвае Праскоўі, як правільна рыхтаваць цеста. Вось і сёння спяклі.

Вяртаючыся дамоў, думала: і сапраўды чалавек можа, павінен, абавязан змагацца са сваім лёсам, з выпаўшымі няшчасцямі.

**Наталля КАЦЯШОВА.**

**Кацяшова, Н. Усяму віной вайна** / Наталля Кацяшова // Шлях Кастрычніка. — 1993. — 1 снежня. — С. 2.
*Лёс Ганны Дзянисаўны Зубачовай жыхаркі в. Баханы.*